# Выстаўка ў Белар. Дзяржаўнай Бібліятэцы.

Выстаўка адбіла сабой увесь той шлях, які прайшлі мы, пачынаючы Кастрычнікам і канчаючы нашым часам.

Падзяляецца выстаўка на гэткія аддзелы: 1) Кастрычнік на Беларусі, 2) Чырвоная армія, 3) Правадыр 4) Куток зьмены, 5) Асьвета, 6) Кастрычнік у Ленінградзе і Маскве, 7) Гаспадарка і 8) Права.

У першым аддзеле—Кастрычнік на Беларусі—сабрана шмат каштоўных і рэдкіх матар'ялаў.

Тут ёсьць і лістоўкі з подпісам А. Мясьнікова і Чарвякова, у якіх зазначаецца, што ўся ўлада павінна прыналежаць Саветам раб. і сялян.

Ёсьць тут і першыя нумары ... Беларусі".

Другі аддзел—Чырвоная армія. Добра ведома нам, якія этапы перажывала армія, як з невялікага гуртка рабочых чырвона-гвардзейцаў разраслася яна ў магутную, грозную для буржуазеі Чырвоную армію.

У аддзеле „Правадыр" сабраны кніжкі на розных мовах—беларускай, расейскай, жыдоўскай і ўкраінскай.

Кніжкі ёсьць на розныя тэмы, як жыцьцё Ільліча, яго заветы, Кастрычнік, Ленін і інш.

Куток «Зьмены» невялічкі, але зроблен ён добра. Ёсьць у ім гісторыя ЛРКСМ і праца, якая павінна весьціся ў камсамольскіх клюбах. Гэты аддзел адбіў камсамольскае жыцьцё быцьцё.

Радзіўся Кастрычнік у Петраградзе і адтуль ужо рашыоўся па ўсёй Расеі тварыць новае жыцьцё. Вось гэта яго нараджэньне добра і адбіваецца ў аддзеле «Кастрычнік». Тут ёсьць і газэта «Праўда» за 25 кастр. 1917 г., ёсьць тут і малюнкі з жыцьця і барацьбы ў Кастрычніку.

У аддзеле асьветы сабраны кніжкі па розных пытаньнях: аб рабкоры, кузьніцы новага жыцьця—універсытэце і інш. Аддзел гаспадаркі адбіў моманты будоўлі і росту нашага Саюзу. Куток кампартыя—правадыр Кастрычніка—адбіў жыцьцё нашай партыі за 25 гадоў працы.

Выстаўка будзе цягнуцца да 11 лістапада ўключна. Як Першамайскі.